# УЗРОВЕНЬ СФАРМІРАВАНАСЦІ КАШТОЎНАСНЫХ АРЫЕНТАЦЫЙ НАВУЧЭНЦАЎ ПРЫ НАВУЧАННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ (НА МАТЭРЫЯЛЕ КАНСТАТУЮЧАГА ЭКСПЕРЫМЕНТА Ў 9–10 КЛАСАХ)

*В.І. Андрэйчык*
*Мінск, Акадэмія адукацыі*

Фарміраванне каштоўнасных арыентацый навучэнцаў з’яўляецца адной з прыярытэтных задач сучаснай педагагічнай навукі. У кантэксце навучання беларускай мове гэты працэс разглядаецца як засваенне сацыяльна значных каштоўнасцей, авалоданне камунікатыўнай дзейнасцю і паглыбленне ў культурнае і моўнае асяроддзе. Як адзначаюць Г.М. Валочка, В.У. Зелянко [1], А.Д. Дзейкіна [2], С.В. Нікалаенка [3], фарміраванне каштоўнасных арыентацый адбываецца на моўным матэрыяле: праз тэксты, маўленчую і камунікатыўную дзейнасць навучэнцы далучаюцца да нацыянальнай культуры, асэнсоўваюць сацыяльна значныя каштоўнасці і набываюць вопыт іх асабістага перажывання. Эфектыўнасць гэтага працэсу залежыць ад узроўню сфарміраванасці каштоўнасных арыентацый навучэнцаў, што абумоўлівае неабходнасць іх дыягностыкі на этапе канстатуючага эксперымента. Мэтай даследавання з’яўляецца выяўленне зыходнага ўзроўню сфарміраванасці каштоўнасных арыентацый навучэнцаў 9–10 класаў у працэсе навучання беларускай мове.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання паслужылі навукова-метадычная літаратура, сістэма дыягнастычных заданняў, пісьмовыя работы навучэнцаў 9–10 класаў. Выбар у якасці ўдзельнікаў навучэнцаў 9-х класаў абумоўлены прынцыпам адноснай завершанасці зместу навучання беларускай мове на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Для дасягнення мэты даследавання выкарыстаны наступныя метады: тэарэтычны аналіз навуковых крыніц; педагагічны эксперымент (канстатуючы этап); якасны і колькасны аналіз пісьмовых адказаў навучэнцаў; параўнальны аналіз вынікаў па ўзроўнях сфарміраванасці кампанентаў каштоўнасных арыентацый.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Выбарку склалі 320 навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Дыягностыка ажыццяўлялася па вылучанай намі чатырохкампанентнай структуры каштоўнасных арыентацый: ведава-зместавым (веды пра каштоўнасці, разуменне іх сутнасці), эмацыянальна-каштоўнасным (эмацыянальнае стаўленне да каштоўнасцей) камунікатыўна-дзейнасным (уменне выказваць каштоўнасна-арыентаваныя думкі і дзейнічаць у камунікатыўнай сітуацыі) і рэфлексійна-ацэначным (самааналіз, ацэнка паводзін).

У якасці інструментарыю выкарыстоўваўся комплекс з 8 дыягнастычных заданняў (кагнітыўна-аналітычных, аксіялагічна-сітуацыйных, камунікатыўна-прадуктыўных і рэфлексійных). Кожнаму з кампанентаў структуры каштоўнасных арыентацый адпавядае абагульнены крытэрый. Для ацэнкі сфарміраванасці каштоўнасных арыентацый вылучаліся чатыры ўзроўні (высокі, сярэдні, нізкі, нездавальняючы), якія спалучаюць якасныя і колькасныя паказчыкі. Колькасныя паказчыкі ранжыруюцца па 4-х бальнай шкале 0, 1, 2, 3 балы.

Для дыягностыкі *ведава-зместавага кампанента* прапаноўваліся заданні, скіраваныя на аналіз аксіялагічнага тэксту, тлумачэнне ключавых каштоўнасных паняццяў, веданне беларускіх прыказак. Аналіз выканання заданняў выявіў, што толькі 14,1% навучэнцаў (высокі ўзровень) падабралі загаловак, які адпавядае зместу тэксту і адлюстроўвае яго аўтарскую пазіцыю, вылучылі як названыя ў тэксце каштоўнасці (*сяброўства, працавітасць, малая радзіма, талерантнасць, мір, калектывізм*), так і больш глыбокія паняцці, закладзеныя ў кантэксце (*патрыятызм, гістарычная памяць*). Іх тлумачэнні характарызуюцца глыбінёй і аргументаванасцю. Напрыклад паняцце

"*мір*" раскрываецца не проста як адсутнасць вайны, а як "*аснова стабільнага жыцця і развіцця грамадства*"; *родны кут* ператвараецца з канкрэтнага геаграфічнага месца ў "*сімвал культурнай спадчыны і духоўны цэнтр*". Навучэнцы валодаюць глыбокімі ведамі пра нацыянальныя каштоўнасці і здольныя аргументавана іх тлумачыць. 27,5% навучэнцаў (сярэдні ўзровень) правільна растлумачылі 5 каштоўнасцей з тэксту і падабралі адпаведныя, але пераважна канстатуючыя загалоўкі, якія адлюстроўваюць толькі тэматыку тэксту, без паглыбленага адлюстравання сэнсава-цэласнага адзінства. Характэрна тэндэнцыя да агульнага разумення аксіялагічных паняццяў, аднак іх інтэрпрытацыя тлумачыцца няпоўна. Пераважная большасць навучэнцаў (45,3%) знаходзіцца на нізкім узроўні, павярхоўна разумеюць змест тэксту, вылучаюць асобныя каштоўнасці ў тэксце, не ўмеюць растлумачыць іх значэнне і прывесці прыклады: *Памяркоўнасць – быць памяркоўным. Калектывізм – быць калектыўным.* На нездавальняючым узроўні (13,1%) фіксуецца несфарміраванасць аналітычных уменняў: адказы адсутнічаюць, або ўяўляюць сабой механічнае капіраванне апошняга сказа тэксту без спроб самастойнага асэнсавання.

13,1% навучэнцаў (высокі ўзровень) дэманструюць дакладнае веданне беларускіх прыказак. Навучэнцы гэтай групы правільна ўзнаўляюць змест 10 прыказак, прапанаваных ў заданні, дадаюць уласныя каментарыі, раскрываюць іх сэнс, што сведчыць аб тым, што прыказкі з'яўляюцца для іх часткай моўнай свядомасці. Сярэдні ўзровень (19,4%) выяўляецца ў частковым узнаўленні моўных форм. Нізкі ўзровень (40,3%) характарызуецца спробамі лагічнай рэканструкцыі, якія зводзяцца да аднаго слова або кароткай фразы, замяшэннем блізкіх па структуры прыказак і выпадковымі адказамі. Напрыклад: *Родная зямелька як ... маці; душа. Хто працуе, той ... есь.* Адказы навучэнцаў нездавальняючага ўзроўню (27,2%) адсутнічаюць або зводзяцца да выпадковых слоў. Напрыклад: *Здаровы багатаму ... не перашкода.*

Для ацэнкі ўзроўня сфарміраванасці *эмацыянальна-каштоўнаснага кампанента* выкарыстоўваліся заданні, якія патрабавалі ад навучэнцаў вырашыць сітуацыі маральнага выбару, растлумачыць базавыя маральныя паняцці з выкарыстаннем антонімаў, выказаць уласнае стаўленне да ключавых каштоўнасцей (*Радзіма, мова, адукацыя* і інш.), апісаць станоўчыя і адмоўныя рысы характару сябра з выкарыстаннем простых двухсастаўных сказаў, сфармуляваць тры жаданні да *залатой рыбкі* ў форме аднасастаўных сказаў.

Аналіз вынікаў выявіў, што толькі 17,2% навучэнцаў дасягнулі высокага ўзроўню сфарміраванасці эмацыянальна-каштоўнаснага кампанента. Іх адказы вылучаюцца аргументаванасцю і арыентацыяй на агульначалавечыя каштоўнасці: дабрыню (74,5%), шчырасць (63,3%), здароўе (74,5%) і мір (54,5%). Характэрна, што адукацыя для гэтай групы важнейшая за грошы (23,6% супраць 20,0%), а разуменне грамадзянства ўключае адказнасць за будучыню краіны. Яны паспяхова выкарыстоўваюць антанімічныя пары для тлумачэння маральных катэгорый (дабро/зло) і дэманструюць цэласную сістэму перакананняў. У навучэнцаў сярэдняга ўзроўню (21,6%) назіраецца змяшчэнне прыярытэтаў да асабістага камфорту і матэрыяльных выгад (грошы займаюць больш высокае месца ў рэйтынгу жаданняў – 26,1%). Адказы правільныя, але спрошчаныя: навучэнцы называюць рысу і тлумачыць яе, аднак не раскрываюць, не аргументуюць свой адказ, чаму гэта важна канкрэтна для іх*: Я цаню сяброў з пачуццём гумару. Таксама важна каб чалавек быў разумны і праўдзівы.* Групы нізкага (27,8%) і нездавальняючага (33,4%) узроўняў дэманструюць матэрыяльна-спажывецкую накіраванасць: для нізкага ўзроўню грошы (31,5%) важнейшыя за адукацыю (13,5%), а для нездавальняючага ўзроўню грошы займаюць другое месца (30,8%). Навучэнцы просяць вялікія фінансавыя сумы, дарагую тэхніку, статус у грамадстве. Разуменне паняцця *грамадзянства* зводзіцца да факта пражывання ў краіне. Маральныя паняцці тлумачаць шаблоннымі фразамі, не выконваюць моўныя патрабаванні задання.

У сітуацыях маральнага выбару толькі 16,2% навучэнцаў дасягнулі высокага ўзроўню сфарміраванасці эмацыянальна-каштоўнаснага кампанента. У іх адказах назіраецца павага да роднай мовы, яны свядома тлумачаць свой выбар, дакладна выконваюць маўленчыя патрабаванні. 20,6% навучэнцаў (сярэдні ўзровень) прадэманстравалі станоўчае стаўленне да роднай мовы, сямейных каштоўнасцей, аднак іх выбары не заўсёды паслядоўны, недастаткова аргументаваныя, моўныя патрабаванні выкананы часткова. Большасць старшакласнікаў паказалі нізкі (28,2%) і нездавальняючы (35,0%) узроўні. Адказы супярэчлівыя, або адсутнічаюць, моўныя патрабаванні не выкананы.

Заданні у якіх навучэнцам прапануецца стварыць уласныя аргументаваныя выказванні на аснове каштоўнасных паняццяў і даць крытычную ацэнку ролі інтэрнэт-прасторы ў працэсе самаразвіцця скіраваны на дыягностыку сфарміраванасці *камунікатыўна-дзейнаснага кампанента.* Разгорнутыя, звязаныя, лагічна структураваныя адказы дэманструюць 18,1% навучэнцаў (высокі ўзровень). Яны асэнсавана вылучаюць станоўчыя і адмоўныя аспекты інтэрнэту, прыводзяць канкрэтныя жыццёвыя прыклады, выкарыстоўваюць ацэначную лексіку. Навучэнцы сярэдняга ўзроўню (24,1%) ствараюць граматычна правільныя выказванні, здольны адзначыць як карысць, так і рызыкі выкарыстання інтэрнэту, аднак адказы недастаткова разгорнутыя і грунтоўныя. Навучэнцы нізкага ўзроўню – 41,6% пералічваюць некалькі станоўчых і адмоўных аспектаў інтэрнэту ў выглядзе асобных слоў ці кароткіх намінатыўных канструкцый без тлумачэння. У навучэнцаў нездавальняючага ўзроўню (16,2%) адказы адсутнічаюць або фармальныя, яны называюць 1–2 агульныя аспекты, не ўмеюць і не робяць спробы стварыць закончанае выказванне.

Для ацэнкі *рэфлексійна-ацэначнага кампанента* выкарыстоўваліся заданні, у якіх навучэнцам прапануецца ацаніць прычыны ўласных цяжкасцей у авалоданні роднай мовай. 13,4% навучэнцаў (высокі ўзровень) дапісваюць разгорнутыя адказы, акрамя выбару адказу з прапанаваных, яны канкрэтызуюць свой выбар, ацэньваюць уласную матывацыю і прапануюць шляхі паляпшэння: *Недастатковая практыка маўлення – гэта мая праблема.* Навучэнцы сярэднага ўзроўню (14,1%) даюць кароткія тлумачэнні, часткова прызнаюць ўласную долю адказнасці, але аналіз прычын і магчымых шляхоў пераадолення цяжкасцей застаецца павярхоўным*: Я разумею, што беларуская мова таксама важная, бо яна родная.* Навучэнцы нізкага ўзроўню (21,6%) выбіраюць 1–2 адказы з адмоўным значэннем, адсутнічае рэфлексія, не робяць спробы аналізаваць уласныя цяжкасці ў навучанні беларускай мове. Група нездавальняючага ўзроўню (50,9%) выбірае некалькі варыянтаў адказу без каментарыяў; адказнасць перакладаецца на знешнія абставіны.

**Заключэнне.** Даследаванне паказала, што ўзровень сфарміраванасці каштоўнасных арыентацый навучэнцаў 9–10 класаў застаецца недастатковым. Высокіх паказчыкаў дасягае толькі невялікая частка навучэнцаў (13–18%) ва ўсіх чатырох кампанентах – ведавым, эмацыянальна-каштоўнасным, камунікатыўна-дзейнасным і рэфлексійна-ацэначным. Большасць навучэнцаў дэманструе нізкі (21,6–45,3%) або нездавальняючы (13,1–50,9%) ўзровень, што выяўляецца ў павярхоўным разуменні каштоўнасцей, слабай аргументацыі, матэрыяльна-спажывецкіх прыярытэтах і недастатковай здольнасці да рэфлексіі. Атрыманыя дадзеныя пацвярджаюць неабходнасць распрацоўкі і ўкаранення спецыяльнай методыкі, накіраванай на мэтанакіраванае фарміраванне ўсіх кампанентаў каштоўнасных арыентацый у працэсе навучання беларускай мове.

1. Валочка, Г. М. Фарміраванне каштоўнасных арыентацый навучэнцаў у працэсе навучання беларускай мове / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко // Аксиология филологического образования в контексте подготовки педагога будущего : Материалы международной научно-практической конференции, посвященной 85-летию со дня рождения проф. Л.А. Муриной, Минск, 22–23 марта 2021 года / Редколлегия: О. В. Проскалович (гл. ред.) [и др.]. – Минск: Белорусский государственный университет, 2022. – С. 25-30.

2. Дейкина, А. Д. Аксиологическая методика преподавания русского языка: монография / А. Д. Дейкина. – М. : МПГУ, 2019. – 281 с.

3. Николаенко, С. В. Лингвометодическая система социокультурного развития учащихся на основе овладения ценностями белорусской культуры в контексте изучения русского языка (V–XI классы) : дис. … д-ра пед. наук 13.00.02 / С. В. Николаенко. – Минск, 2016. – 272 с.